**УДК 821.111**

# СПАСЦІЖЭННЕ ВАЕННАЙ РЭЧАІСНАСЦІ Ў ЭПІСТАЛЯРНАЙ СПАДЧЫНЕ Э. ХЕМІНГУЭЯ

***канд. філал. навук, дац. З.І. ТРАЦЦЯК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***zoya.tretyak@rambler.ru***

*Разглядаецца эпісталярная спадчына Э. Хемінгуэя, што з'яўляецца значнай крыніцай для вывучэння жыцця і творчасці празаіка. Упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве падаюцца пераклады на беларускую мову асобных урыўкаў з лістоў пісьменніка. Асаблівая ўвага надаецца запісам, прысвечаным ваенным падзеям, на якія багата першая палова ХХ ст. Заўважана, што адносіны мастака слова да ўзброеных канфліктаў змяняліся. Узнёсласць і натхненне з нагоды Першай сусветнай саступіла месца канчатковаму расчараванню пасля Грамадзянскай вайны ў Іспаніі. Тая ж думка пацвердзілася ў 1944 г. у Францыі. У сталым узросце пісьменнік спрабуе аб'ектыўна ацаніць уласны ўдзел у татальных і лакальных канфліктах. Гэты факт знайшоў адлюстраванне на старонках яго лістоў. Прыватныя запісы абвяргаюць некаторыя міфы пра Э. Хемінгуэя як звышмужную асобу.*

***Ключавыя словы:*** *амерыканская літаратура, эпісталярная спадчына, літаратурна-мастацкая творчасць, журналістыка, вайна-кантынуум*

**Уводзіны.** Сучасная амерыканістыка аперуе тэзісам пра скразны характар ваеннай тэматыкі ў творах Э. Хемінгуэя. Абгрунтаванне ідэі закладзена ў працах К. Бэйкера [1] і Ч. Фэнтана [2], што выйшлі з друку пры жыцці празаіка. Вывучэнне апавяданняў і раманаў, дзе ўзнаўляюцца ўзброеныя канфлікты першай паловы ХХ ст., мажліва толькі з прыцягненнем журналісцкай [3] і эпісталярнай [4] спадчыны аўтара. У сукупнасці дадзеныя крыніцы дазваляюць рэканструяваць адносіны Э. Хемінгуэя да вайны, як аднаго з чыннікаў, што абумовілі грамадска-палітычнае быццё і адбіліся на працы мастакоў слова.

Лаўрэат Нобелеўскай прэміі крытычна ставіўся да інфармацыі і прыватных меркаванняў, якія ўзнікалі пад час яго зносін з адрасатамі па розныя бакі акіяну: «Асабістыя лісты нярэдка паклёпніцкія, заўсёды нястрыманыя і часта непрыстойныя …[1]» (*the personal letters are often libelous, always indiscreet, often obscene*) [4, p. 750]. У некаторых выпадках празаік прапаноўваў знішчаць правакацыйныя ці скандальныя запісы, што маглі трапіць да недобрасумленных даследчыкаў, рэпарцёраў. Нягледзячы на выразную суб'ектыўнасць ліставанне пісьменніка – каштоўная крыніца вывучэння яго жыццёвага і творчага шляху.

Матэрыялам даследавання стала кніга «Эрнэст Хемінгуэй. Выбраныя лісты. 1917–1961» (1981) пад рэдакцыяй К. Бэйкера. Эпісталярная спадчына празаіка пакуль не загучала па-беларуску. Айчынныя чытачы і літаратуразнаўцы знаёмяцца з асобнымі лістамі мастака слова на рускай мове, дзякуючы выданню «… Оставаться самим собой …» [5] і вытрымкам у кнізе «Хемінгуэй» М. Чартанава [6].

**Асноўная частка.** Вывучэнне лістоў амерыканскага класіка пацвярджае, што яго адносіны да вайны-кантынуума крышталізаваліся напрацягу некалькіх год і звязаны з асобнымі этапамі назапашвання жыццёвага вопыту: 1) рамантызацыя падзей Першай сусветнай; 2) асэнсаванне ведаў, набытых ў 1918 г. (у сувязі з лакальнымі войнамі, наведанымі пад час журналісцкіх вандровак); 3) крытыка фашызму і нацызму, як звыродных праяў сучаснай Э. Хемінгуэю цывілізацыі, меркаванні наконт будучага татальнага супрацьстаяння; 4) удзел ва ўзброеным канфлікце як абавязак добрасумленнага чалавека (падзеі ў Іспаніі (1937–1938) і Францыі (1944)); 5) вайна як успамін (пасля заканчэння Другой сусветнай); 6) роздум пра ваенную літаратуру сучаснасці і мінулага (у тым ліку і пра ўласныя творы).

Першыя лісты, у якіх Э. Хемінгуэй занатаваў свае думкі наконт вайсковай кар'еры, датуюцца кастрычнікам 1917 г.: малады чалавек інфармаваў бацькоў пра службу ў Нацыянальнай гвардыі[2] [4, p. 2–3]. У красавіку наступнага года ён уступіў у шэрагі Чырвонага крыжа. Адначасова будучы пісьменнік працягнуў журналісцкую дзейнасць: «Увесь гэты тыдзень я займаўся вярбоўкай. Пісаў гісторыі пра сухапутныя войскі, флот, марскую пяхоту, англаканадцаў і гэтымі днямі пра службу ў танкавых войсках, якія толькі што з'явіліся» (*All this week I have been handling recruiting. Writing stories about the Army, Navy, Marines, British-Canadian and lately the new Tank Service*) [4, p. 5]. Варта ўвагі тое, што аўтар невысока ставіўся да накідаў, бо ім бракавала арыгінальнасці. Фактaлагічныя недахопы і другаснасць зместу запісаў відавочныя.

[1] Тут і далей пераклад цытат з лістоў Э. Хемінгуэя з англійскай мовы наш. – *З.Т.*
[2] Тэрытарыяльнае воінскае фармаванне ў ЗША, рэзерв рэгулярных войскаў.

У маі 1918 г. пачынаецца іншая фаза ў жыцці Э. Хемінгуэя. Фактычна навабранец, ён атрымаў званне «ганаровага лейтэнанта», пачаў захапляцца адмысловым статусам, амуніцыяй і выключнай свабодай (*We have all our time to ourselves and have to report to no one* [4, p. 6]). Апафеоз знаходжання ў Нью-Йорку – парад на Пятай Авеню, які 18 мая 1918 г. прымаў В. Вільсан. Падзея – нагода для ліста, дзе спалучыліся факты і плён яго няўрымслівай фантазіі. Ганарліва-саркастычны тон, абраны аўтарам, што імкнуўся падаць сябе як дасведчанага ў жыцці чалавека, будзе дамінаваць яшчэ некаторы час.

«Ганаровы лейтэнант» апавядаў пра прыгоды, што напаткалі яго на шляху ў Еўропу і непасрэдна ў Італіі. Увагі патрабуюць лісты да родных і сяброў, якія пабачылі свет пасля яго ранення пад Фасальтай (8 ліпеня 1918 г.). Запісы дазваляюць рэканструяваць падзеі таго часу, бо празаік быў схільным да міфатворчасці. Э. Хемінгуэй неаднойчы «перарабляў» гэты перыяд біяграфіі (асабліва калі размова ішла пра празаічныя заняткі «доблеснага воіна»: распаўсюджванне цыгарэт і шакаладу на перадавой у час зацішша). Паводле В. Кэйл, «падобныя фальсіфікацыі распаўсюджваліся некалькі год і сталі такой назолай, што ён марна спрабаваў адмежавацца ад іх» (*These fabrications continued to circulate for years, becoming such an embarrassment that he tried to dissociate himself from them, to no avail*) [7, p. 14].

Прыклад беспаспяховых спроб – зварот да М. Перкінса: «… Мяне параніла, у мяне чатыры італьянскія ўзнагароды: La Medaglia d'argento al valore militare і Croce di guerre (3). Але я атрымаў іх не за геараічныя ўчынкі, а проста таму, што быў амерыканцам, адкамандзіраваным у італьянскую армію. Прынамсі, адзін Croce di guerre я атрымаў памылкова. Ва ўзнагародным спісе згаданы бой за Monte Maggio – перавозіў параненых пад пякельным артылерыйскім агнём. Я не ўдзельнічаў у баі, бо ў той час быў у шпіталі за 300 кіламетраў ад месца дзеяння» (*… I was wounded and have four Italian decorations Medaglia d'argento al valore militare and Croce di guerre (3) but all of them were given me not for valourous deeds but simply because I was an American attached to the Italian army. At least one of the Croce di guerre was given me by mistake and the citation mentions an action on Monte Maggio – transport of wounded under heavy bombardment – which I did not participate in – being 300 kilometres away in the hospital at the time*) [4, p. 248]. Відавочна, што тлумачэнні не пераканалі сапраўдных адрасатаў: чытачоў, журналістаў і нават асобных даследчыкаў, якія не страцілі ілюзій у дачыненні да жыццяпіса знакамітага мастака слова.

Крытыцызм у адносінах да ўласнай асобы з'явіўся значна пазней, таму 21 ліпеня 1918 г. Э. Хемінгуэй з годнасцю звярнуў увагу на тое, што ён – першы амерыканец, якога параніла на той частцы фронту (*I'm the first American wounded in Italy* [4, p. 12]). У той час будучы пісьменнік мэтанакіравана ствараў геаічна-самаахвярны вобраз салдата, загартаванага ад параз. Сімптаматычна, што ён не выказваў асаблівых патрыятычных памкненняў. «Прышчэпкай» ад такіх думак былі, верагодна, назіранні Эрнэста Хола (дзеда пісьменніка па матчынай лініі), які аднойчы заўважыў: «… патрыятызм – апошняе апірышча злодзеяў і мярзотнікаў» *(… patriotism is the last refuge of thieves and scoundrels*) [4, p. 811].

Недахоп ведаў пра ваенныя дзеянні хаваўся за гіпербалізаванымі аповедамі пра прыгоды: «… мяне абстрэльвалі фугаснымі і хімічнымі снарадамі, шрапнеллю. Расстрэльвалі з акопнага мінамёта, снайперскай вінтоўкі і кулямёта, і, у дадатак да ўсяго гэтага хараства, кулямётнай чаргой з аэраплана, што лётаў над перадавой лініяй» *(… I've been shelled by high explosive, shrapnel and gas. Shot by trench mortars, snipers and machine guns, and as an added attraction an aeroplane machine gunning the lines*) [4, p. 14]. Пералік уражваў недасведчаных у франтавых справах амерыканцаў, дазваляў бацькам сведчыць, што іх сын – годны нашчадак продкаў, якія змагаліся ў час Грамадзянскай вайны.

Нягледзячы на пакуты ў шпіталі, Э. Хемінгуэй разважаў пра вайну ў рамантычна-авантурысцкім рэчышчы. Узнікае ўражанне, што лісты адрасаваны не столькі бацькам і родным, колькі скіраваны на шырокую аўдыторыю: іх публікавалі ў перыядычных выданнях Оак-Парка і Чыкага [8, p. 33]. Такім чынам тлумачацца блытаныя пасажы кшталту: «… На гэтай вайне няма герояў. Мы прапануем плоць, але абіраюць толькі некаторых … Ім проста пашчасціла … Усе героі памёрлі. А сапраўдныя героі – бацькі. Памерці – лёгка» (*… There are no heroes in this war. We all offer our bodies and only a few are chosen … The are just the lucky ones … All the heroes are dead. And the real heroes are the parents. Dying is a very simple thing*) [4, p. 19]. Пафасныя разважанні пра жыццё і смерць суседнічаюць з поўнымі юнацкага захаплення выказваннямі пра амуніцыю, медалі і сувеніры, знойдзеныя на полі бою. Пазней Э. Хемінгуэй дыстанцаваўся ад падобных ідэй: наіўна-рамантычныя выказванні зрабіліся аб'ектам з'едлівай іроніі (згадаем, напрыклад, Эторэ Марэці з рамана «Бывай, зброя!»).

У 1953 г. пісьменнік ацаніў той перыяд жыцця так: «… на першай вайне больш за ўсё я слухаў размовы хлопцаў, асабліва ў шпіталі … Іх вопыт быў больш яскравым, чым асабіста мой. Пачынаеш выдумляць, абапіраючыся на ўласныя і чужыя назіранні …» (*… in the first war all I did mostly was hear guys talk; especially in hospital … Their experiences get to be more vivid than your own. You invent from your own and from all of theirs …*) [4, p. 800]. Прынцып адвольнага спалучэння асабістага і пачутага пакладзены ў аснову некаторых твораў Э. Хемінгуэя на ваенную тэматыку.

Першая сусветная скончылася, і малады ветэран накіраваўся дадому. Вядомая з дзяцінства атмасфера кардынальна адрознівалася ад той, што панавала ў Італіі. Былы «ганаровы лейтэнант» страціў бязмежную свабоду і ўнікальны статус, сутыкнуўся з абыякавасцю. Так нарадзіліся прыкрыя думкі, якімі ён падзяліўся з сябрам: «Крый цябе божа вярнуцца ў гэту краіну … У мяне ёсць патрыятычныя пачуцці, і я гатовы загінуць за гэту цудоўную і славутую нацыю. Але, каб іх чорт узяў, я не жадаю тут жыць» (*Don't for the Lord's sake come to this country … I'm patriotic and willing to die for this great and glorious nation. But I hate like the deuce to live in it*) [4, p. 21]. Згадкі пра нейкія адмысловыя адносіны да радзімы гучалі як няўклюдыя спробы апраўдацца.

На некаторы час успаміны пра 1918 г. адышлі на другі план. Воляй лёсу Э. Хемінгуэй трапіў у вір парыжскага культурнага жыцця, пачаў займацца літаратурнай творчасцю, не забыўся на журналісцкія абавязкі. Вандроўкі па Еўропе сведчылі, што Першая сусветная хавалася ў глыбінях памяці, але вайна, як чыннік, што кіраваў быццём заходняй цывілізацыі, не страціла дэструктыўнага патэнцыялу.

У ліпені 1923 г. Э. Хемінгуэй зноў трапіў у Фасальту. Падарожжа па знаёмых мясцінах ён падаў так: «… абсалютна новы брыдкі горад, дзе не засталося нічога з таго, што магло б нагадаць пра вайну, акрамя шрамаў на дрэвах … Ніводнай прыкметы старых акопаў. Усе зруйнаваныя дамы адбудаваны … » (*… a brand new ugly town with nothing to remind you of the war except the scars in the trees which are growing over … Not a sign of the old trenches. All the wrecked houses rebuilt …*) [4, p. 86]. Жыццё на шматпакутнай зямлі аднаўлялася, але аўтар адчуваў, што справа зноў ішла да катастрофы. Літаральна ў наступным абзацы ён згадваў новыя пагрозы (дзейнасць Мусаліні, зараджэнне фашызму ў Італіі, падзеі ў Канстантынопалі).

Абставіны і ўзрост вымушалі перагледзець адносіны да вайны, якая бясконца панавала ў Еўропе. Звяртаючыся да Ф.С. Фіцджэральда (снежань 1925 г.), празаік пісаў: «… вайна – найлепшая тэма. Яна збірае максімальную колькасць матэрыялу, паскарае дзеянне, прыносіць з сабою ўсялякія звесткі, што ў звычайных абставінах прыходзіцца назапашваць напрацягу жыцця» (*… war is the best subject of all. It groups the maximum of material and speeds up the action and brings out all sorts of stuff that normally you have to wait a lifetime to get*) [4, p. 176]. Згаданыя радкі – споведзь творцы, які спазнаваў уласныя магчымасці, фармуляваў крэда. З другога боку, Э. Хемінгуэй разважаў пра 1918 г. як чалавек, што вытрываў выпрабаванне вайной. У тым жа лісце чытаем: «… пад час цалюткага спектакля я не пабачыў і не атрымаў нічога сапраўды вартага …» (*… I didn't see or get anything worth a damn out [of it] as a whole show*) [4, p. 177]. Трэба ўлічваць, што пісьменнік мог не апавядаць пра ролю падзей 1918 г., каб не дражніць калегу-адрасата, які не трапіў на фронт.

У 1920-я гг. пісьменнік знаёміцца з творамі сучаснікаў на ваенную тэматыку. Уражанні ад прачытанага паўстаюць на старонках яго лістоў. Згадваюцца працы Т. Бойда, Р. Грэйвза, У. Кэзэр, Э.М. Рэмарка, Л. Столінгса, З. Сэсуна, Дж. Томасана, Х. Элена, А.Г. Эмпі і інш. Назва зборніка апавяданняў Дж. Томасана «Прымкнуць штыхі!» (*Fix Bayonets!*, 1925) прыцягнула ўвагу Э. Хемінгуэя: «… калі пішаш кнігу, што не мае рамантычнага флёру, … сорамна жывіць рамантычныя ілюзіі наконт штыхоў. Штых – добрая і рамантычная рэч, але сам факт таго, што ён прымацаваны да вінтоўкі … аўтаматычна абмяжоўвае сферу яго ўжывання …» (*… if you are writing a book that isn't romantic … it is a shame to get awfully romantic about bayonets. The bayonet is a fine and romantic thing but the very fact of its being attached to a rifle … restricts its use …*) [4, p. 202]. Празаік выказаў свае адносіны да літаратараў, якія асвятлялі вайну ў геранічна-авантурысцкім рэчышчы, уводзячы ў зман моладзь.

На пачатку 1930-х гг. амерыканскі пісьменнік усвядоміў галоўную пагрозу: «… Я не магу выносіць Гітлера, бо адзінае, на што ён працуе – вайна. Ён кажа адно, а робіць зусім іншае. Вайна – здаровы стан дзяржавы. Кожнаму, кім авалодала такое ўспрыманне дзяржавы, неабходна вайна ці пагроза вайны, каб краіна працягнула сваё існаванне …» (*… I hate Hitler because he is working for one thing: war. He says one thing with his mouth and does another with his hands. War is the health of the State and anyone with his conception of the state has to have war or the threat of war to keep it going …*) [4, p. 398].

Да пачатку новай татальнай катастрофы Э. Хемінгуэй удзельнічаў у не менш значным для яго ўзброеным канфлікце. У чарговы раз ён сутыкнуўся з жорсткасцю свету, але не знаходзіўся пад уплывам рамантычных ілюзій: «Вайна ў Іспаніі – дрэнь … няма нікога невінаватага. Усё, пра што я турбуюся, – чалавек і магчымасць пазбавіць яго ад пакут …» (*The Spanish war is a bad war … and nobody is right. All I care about is human beings and alleviating their sufferings …*) [4, p. 456]. Пісьменнік разумеў, што абодва бакі канфлікту ў аднолькавай ступені павінны несці адказнасць за кровапраліцце. Нягледзячы на гэта ён стаў паплечнікам рэспубліканцаў, якія змагаліся супраць франкісцкага рэжыму.

Падзеі 1937–1939 гг. паўплывалі на светапогляд пісьменніка, які канчаткова зненавідзеў забойства, але лічыў, што «… часам неабходна змагацца. Але ўсё роўна вайна – дрэнь, і кожны, хто сцвярджае адваротнае – ілгун. Вельмі складана і цяжка пісаць пра яе па-сапраўднаму праўдзіва … Адзінае, што застаецца рабіць, калі вайна ўсё ж пачалася, – перамагчы …» (*… sometimes it is necessary to fight. But still war*

*is bad and any man who says it is not is a liar. But it is very complicated and difficult to write about truly … The only thing about a war, once it has started, is to win it …*) [4, p. 480]. У тым жа лісце, адрасаваным І. Кашкіну, Э. Хемінгуэй тлумачыў, што ён спрабаваў дыстанцавацца ад уласных эмоцый і пераваг, каб стварыць аб’ектыўны аповед пра вайну. Празаік разумеў, што дасягнуць такой мэты практычна немагчыма.

Падзеі ў Еўропе адбываліся імкліва, хутка песімістычныя прадказанні літаратара спраўдзіліся: пачалася новая сусветная вайна. Пісьменнік спрабаваў уявіць, колькі часу займе эскалацыя канфлікту: «Прынамсі, вайна працягнецца пяць год ці, можа, дзесяць, ці, можа, заўжды. Усё залежыць ад таго, што мы абяцалі ў якасці яе мэт» (*War will last at least five years, maybe ten, maybe always. Depending on what we have promised as war aims*) [4, p. 536].

У 1944 г. Э. Хемінгуэй зноў трапляе ў тэатр баявых дзеянняў у Старым Свеце. Мастак слова робіць новыя акцэнты, распавядаючы пра падзеі, у якіх ён прымае напаўлегальны ўдзел. У лісце да М. Уэлш чытаем: «Насамрэч наша вясёлае і бесклапотнае жыццё поўніцца забітымі. Нямецкія трафеі, шмат стрэлаў, шмат барацьбы, загарадзі, невялікія пагоркі, пыл ці друз на дарогах, мясцовасць, што патанае ў зеляніне, пшанічныя палі, мёртвыя каровы, коні, новыя пагоркі, мёртвыя коні, танкі, 88-міліметроўкі, машыны, забітыя хлопцы з Амерыкі. Часам зусім не ем, сплю пад дажджом, на зямлі, у адрынах, на раскладушках, на азадку, і заўсёды рухаюся, рухаюся …» (*… Actually we have a very jolly and gay life full of deads. German loot, much shooting, much fighting, hedges, small hills, dusty roads, metalled roads, green country, wheat fields, dead cows, horses, new hills, dead horses, tanks, 88’s, Kraftwagens, dead U.S. guys, sometimes don’t eat at all, sleep in the rain, on the ground, in barns, on carts, on cots, on one’s ass and always moveing, moveing …*) [4, p. 562]. У гэтым урыўку вайна пададзена як рэч вельмі празаічная. Ад былога энтузіязму і захаплення франтавым жыццём не засталося і напаміну. Сталы чалавек звяртаў большую ўвагу на побытавыя нястачы, чым на недахоп рамантыкі ці гераічных памкненняў. Словы патыхалі стомай, бо Э. Хемінгуэй часам не паспяваў за працай ваеннага канвееру. Пісьменнік хаваў некаторыя падрабязнасці, каб не звярнуць на сябе залішнюю ўвагу цэнзараў.

Чарговы ўзброены канфлікт застаўся ў мінулым, і Э. Хемінгуэй зноў вярнуўся да звыклага жыцця. У чэрвені 1946 г. пісьменнік паспрабаваў растлумачыць К. Сіманаву, як франтавая рэчаіснасць уплывала на яго творчасць: «… Пасля першай вайны, на якую я патрапіў, я не мог пра яе пісаць практычна дзевяць год. Пасля вайны ў Іспаніі я быў вымушаны адразу занатоўваць пабачанае, бо я ведаў, што наступная вайна імкліва набліжаецца … Пасля гэтай вайны я тройчы сур’ёзна пабіў галаву … У рэшце рэшт я зноў вярнуўся да творчасці, мой раман ужо заняў 800 рукапісных старонак, а да вайны яшчэ далёка …» (*… After the first war I was in I could not write about it for almost nine years. After the Spanish war I had to write immediately because I knew the next war was coming so fast … After this war I had my head very badly smashed up (three times) … But finally I have gotten writing again all right but my novel, after 800 mss. pages is still a long way from the war …*) [4, p. 607]. Дадзены ліст – нагода ў чарговы раз выказаць захапленне Савецкім Саюзам, як краінай, што змагалася з гітлераўскай навалай. Амерыканскі празаік марыў далучыцца да барацьбы ў якасці ваеннага журналіста, але яго стрымаў моўны бар’ер.

Ужо праз пяць год пасля заканчэння Другой сусветнай, празаік зноў адчуў, што чалавецтва так і не пакінула імкненне змагацца са зброяй у руках. Гэту сітуацыю ён пракаментаваў наступным чынам: «… спадзяюся, што нам не прыйдзецца зноў ісці на вайну і змагацца. Пра сябе я не турбуюся. Хоць у мяне няма такой патрэбы, але я пайду. Але ж небаракі-дзеці …» (*… I hope we don’t have to go and fight again. I don’t care about me. I don’t have to go but I will go. But the poor kids …*) [4, p. 701]. Такія слушныя назіранні спалучаліся з выказваннямі, што ўспрымаліся як рэцэдывы самазахаплення, на якое Э. Хемінгуэй пакутаваў у 1918 г. Пісьменнік з гонарам згадваў, што атрымаў 22 раны на Першай сусветнай і за ўсё жыццё забіў 122 ворага [4, p. 702].

**Вынікі**. Лёс амерыканскага класіка непарыўна звязаны з ваеннай рэчаіснасцю, якую ён старанна ўзнаўляў у літаратурна-мастацкіх творах, журналісцкіх накідах і лістах. Супярэчлівыя падзеі першай паловы XX ст. вымушалі неаднаразова звяртацца да некаторых кульмінацыйных гістарычных момантаў, каб асэнсаваць іх уплыў на асобу і грамадства. Надзвычайнымі падаюцца падзеі Першай сусветнай, грэка-турэцкага супрацьстаяння, Грамадзянскай вайны ў Іспаніі і Другой сусветнай. Э. Хемінгуэй прайшоў шлях ад рамантычнай ідэалізацыі да адмаўлення вайны, што бязлітасна забірала жыцці. Відавочна, што энтузіязм «ганаровага лейтэнанта», які захапляўся відовішчнасцю татальнага канфлікта, саступіў месца расчараванню і стоме сталага мастака слова. Эпісталярная спадчына празаіка, прачытаная ў кантэксце яго прозы, дазваляе прасачыць працэс крышталізацыі негатыўных адносін да ўзаемавынішчэння. Інфармацыя, што паўстае на старонках лістоў, разбурае некаторыя міфы, у стварэнні якіх браў удзел і сам аўтар.

ЛІТАРАТУРА

1. Baker, C. Hemingway. The Writer as Artist / C. Baker. – Princeton : Princeton University Press, 1956. – 355 p.

2. Fenton, Ch.A. The Apprenticeship of Ernest Hemingway. The early years / Ch.A. Fenton. – New York : Farrar, Straus & Young, 1954. – 302 p.
3. By-Line: Ernest Hemingway. Selected Articles and Dispatches of Four Decades / ed. by W. White. – New York : Charles Scribner's Sons, 1967. – 489 p.
4. Hemingway E. Selected Letters. 1917–1961 / ed. by C. Baker. – The Ernest Hemingway Foundation, 1981. – 948 p.
5. Хемингуэй, Э. «... Оставаться самим собой ... »: (избранные письма, 1918 – 1961) / Э. Хемингуэй ; публ., пер. с англ. и коммент. В. Погостина. – М. : Правда, 1983. – 62 с.
6. Чертанов, М. Хемингуэй / М. Чертанов. – М. : Молодая гвардия, 2010. – 576 с.
7. Kale, V. Chronology / V. Kale // Ernest Hemingway in Context / ed. by D.A. Moddelmog, S. del Gizzo. – Cambridge, New York : Cambridge University Press, 2013. – P. 3–11.
8. Spanier, S. Letters / S. Spanier // Ernest Hemingway in Context / ed. by D.A. Moddelmog, S. del Gizzo. – Cambridge, New York : Cambridge University Press, 2013. – P. 33–42.

*Паступіў 16.12.2015*

## WAR REALITY INTERPRETATION IN E. HEMINGWAY'S EPISTOLARY HERITAGE

***Z. TRATSIAK***

*The article is devoted to E. Hemingway's epistolary heritage which is an essential source for the studies of his life and creative work. Some extracts from the writer's letters are translated into Belarusian for the first time. Special attention is drawn to the entries devoted to the war events the first part of the twentieth century was rich in. It is pointed out that the artist's attitude to the military conflicts was changing. High-mindedness and enthusiasm born by the participation in WWI gave way to the complete disillusionment after the Spanish Civil War. The same tendency was proved in 1944 in France. Being a mature person the writer tried to evaluate his participation in total and local conflicts objectively. This fact is obvious from his letters. Personal notes deny some notes about E. Hemingway as a valorous person.*

***Keywords:*** *American literature, epistolary heritage, literary work, journalism, war-continuum.*